Год II. Пятніца, 18 сакавіка (марца) 1921 г. № 11.

НАША ДУМКА

Палітычная, экономічная і літэратурная тыднёвая газэта

ПАДПІСКА: на 3 месяцы 75 марак або 5 ф. мукі. Цана асоб. нумэру 6 марак. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 5 (Пасаж).

Паны на нас злуюць.

„Нямецкая“ статыстыка п. Пузыны.

«Дзіўным здаецца, што «Наша Думка» разам з яе антыпольскай пропагандай можа выхадзіць у Вільні пад польскім урадам Сярэдняй Літвы.“

Юзэф Пузына.

Так канчае сваю стацьцю „Plebiscyt wileński a białorusini“ пан Юзэф Пузына у Варшаўскай газэце „Rzeczpospolita“ № 68, 12 сакавіка (марца) 1921 г.

За што-ж так раззлаваўся вяльможны пан Пузына на „Нашу Думку“?

За „антыпольскую“ агітацыю, якая праводзіцца у стацьці „Плебісцыт і беларусы“, замешчанай у № 7 „Н. Д.“

У чым заключаецца „антыпольскасьць“ стацьці „Плебісцыт і беларусы“.

Перш за усё — ў тым, што ў разе плебісцыту беларусы заклікаюцца галасаваць за Літву, а потым — ў тым, што згодна з польскай статыстыкай 1915 г. даказываецца, што на магчымай плебісцытнай тэрыторыі мы, беларусы, становім пераважаючую і амаль што ні абсолютную большасьць.

Ну, разумеецца, як жа так можна пісаць? Проста і ясна сказаць, што беларусы будуць галасаваць за Літву, значыцца, процiў Польшчы, а потым яшчэ даказваць, што на плебісцытнай тэрыторыі палякоў мала, — ці-ж можна ўсё гэта сьцярпець?

Страшэнна раззлаваўся пан. Юзэф Пузына і... што-б, вы думалі, ён зрабіў?

Параіў зачыніць „Нашу Думку“. Але-ж усё адно—стацьця „Плебісцыт і беларусы“ ужо надрукована і яе трэба спраставаць.

Цікава, як выпаўніў гэту цяжкую задачу п. Пузына.

Ён піша: „Як ведаем, данныя статыстычных баданьняў, якія праводзіліся праз немцаў у 1916—1917 г, зьніштожылі гэтыя фантастычныя цыфры і устанавілі для тэй самай тэрыторыі істнаваньне лічэбнага стасунку названых народнасьцяў немаль адваротнае, з выразнай перавагай польскага элемэнту“.

Далей: „Статыстыка п. Кржыжаноўскага і Куманецкага, зробленая ў 1915 г. для палітычных мэт на грунце расейскіх урадовых статыстык, фальшаваньня якіх было вядома цэламу сьвету, статыстыка гэта, робленая ад бюрка, без знаёмасьці абшару і мясцовых стасункаў... прамаўляе сваёй фантазіяй праз вусны Віленчука“.

Мы ніскольні ня дзівімся таму, што п. Пузына, каб даказаць сваё, абліваe гразьзю сваей дылетанскай крытыкі сур'ёзную працу польскіх прафэсароў, называючы яе „робленай ад бюрка, без знаёмасьці абшару і мясцовых стасункаў“, а нямецкую статыстыку, пры гэтым ня ведама якую, бо аўтор ня кажа, ці надрукавана гэтая нямецкая статыстыка, ці не, а калі надрукована, то гдзе і калі.— гэтую невядомую нямецкую статыстыку бяручы за прыклад. Але калі пан Пузына, кажучы аб нямецкай статыстыцы 1916—17 г.г., мае на ўвазе вядомы нам статыстычны атлас, выдадзены Ober-Ostam ў 1916—17 гадох, то ён мыляецца, што у ім паказан „лічбенны стасунак народнасьцяў нашага краю адваротны“ таму, што мы знаходзім у „Tableau“ Кржыжаноўскага і Куманецкага. Пан Пузына мусіць не разглядаў атласа Ober-Ost-a, бо разгледзіўшы яго, п. Пузына прыйшоў бы да вываду, што і Tableau“ і атлас Ober-Ost-a аб лічбенным стасунку народнасьцяў нашаго краю гавораць адно і тое-самае, г. ё., што не палякі, а беларусы становяць тут у нашым краі пераважаючую большасьць.

Але што-ж вы зробіце з панам Пузынай? Раз „польская“ статыстыка „неблaгонадёжная“, куды нійшло—няхай хоць „нямецкая“ вывозіць. Толькі дарэмна пан Пузына гэту невядомую нікому статыстыку называе нямецкай, бо папраўдзе кажучы, — гэта не нямецкая, а пана Пузына статыстыка, нідзе не надрукованая. Нікому невядомая, ні на чым неабапёртая, апрача разумеецца, грунтоўнага дылетантызму вяльможнага пана Пузыны.

„Панскія міражы.“

Другі яснавяльможны пан, некі Фр. Равіта-Гаўронскі, напісаў у тэй-жа варшаўскай „Rzeczpospolitej“ (№ 65) стацьцю „Беларускія міражы“, гдзе даводзіць, што „Беларусь этнаграфічна ня ёсьць народнасьць“, а „другая галіна тых самых крывічоў, пражываючая ад вярхоўя Дзьвіны да левабярэжн. прытокаў Прыпяці і ад Дняпра, ніжэй Смаленска, да спатканьня з літоўскімі і польскімі пляменьнямі“. Гдзе, у якім месцу гэтая „другая галіна Крывічоў“ спатыкаецца з літоўскім і польскім пляменьнямі, пан Гаўронскі не дагаварывае. Там, мусіць, гдзе гэта выгадней для п. Гаўронскага.

Але пойдзем далей за панам Гаўронскім. Гэтая „другая галіна Крывічоў“ „падлегае ўплывам менш літоўскім, болей польскім. На грунце гэтага ўплыву з часам вырабіўся беларускі язык, маючы з пагляду музыкальнасьці найбольш падобнасьці да польскага. Калі-б ні расейскі альфабэт, можна-б было беларускі язык уважаць за польскі дыялект.“

Як можна відзець з гэтых кароткіх выемак з даўжэннай пісаніны пана Гаўронскага, Беларусі няма. Есьць нейкая „другая“ галіна, пражываючая „адгэтуль і дагэтуль“, але ня маючая грэніц з польскім народам. Бяда — гэтыя граніцы. Вельможныя паны бачаць чужыя граніцы з усіх бакоў, апрача аднаго—польскага боку. Тут, мусіць, кожны з іх гатоў праводзіць граніцы так, каб яго маёнтак папаў у граніцы Польшчы.

Праўду сказаць, тут нічога няма дзіўнага, бо каму ня ведамы праслаўлены панска-польскі імпэрыялізм, сягаючы па пытаньню аб граніцах „ад мора і да мора.“ Далей. Пан Гаўронскі піша, хоць і для вялікіх паноў, каторым „не з навукі хлеб есьці“, але відаць, што ён моцна вучоны, з вучовых найвучонейшы. Ён адкрыў Амэрыку, толькі ня першую, бо першую Амэрыку адкрыў Калюмб, з чым і пан Гаўронскі мусіць згодзен, а другую.

Чым ня другая Амэрыка, што Беларусь зла̀жылася з аднэй толькі часткі крывічоў? Да апошняга часу мы, згодна з вучонымі розных нацыянальнасьцяў, думалі, што беларускі народ злажыўся з трох пляменьняў крывічоў, дрыгвічоў і радзімічаў. Аб гэтым ведаюць навет дзеці нашыя, бо і ў школьных падручніках гаворыцца так, а пан Гаўронскі адкрывае Амэрыку, даказываючы, што мы, беларусы, другая частка Крывічоў, што мы не народнасьць, што з пагляду музыкальнасьці (?) мова наша найбольш падобна да польскай, што калі-б не альфабэт расейскі (?), то беларускую мову можна-б было уважаць за польскі дыялект. Адным словам, народ беларускі не народ, а так нешта нявыразнае: ні то інструмэнт, на каторым паны Гаўронскія хацелі-б разыгрываць свае сымфоніі, ні то поле. парошае расейскімі літэрамі, замест якіх трэба насеяць польскіх літэр. Тады усё будзе добра. Паны плянтатары прышчэпяць так званаму беларускаму быдлу дзяржаўнасьць з свайго пагляду, бо па іх зданьню беларускае грамадзянства не прыгатавана навет для палітычнага жыцьця, ня то што дзяржаўнасьці.

А калі так, то ніякай дзяржаўнай незалежнасьці Беларусь ня можа мець, досыць для яе культурнай аўтаноміі.

І пан Гаўронскі расказвае далей пра Раду Беларускай Рэспублікі, пра раскол у ёй, пра Найвышэйшую Раду пяцёх, каторая „заключыла з польскім урадам якую-сь тайную умову, гварантуючую беларусам культурна-нацыянальную аўтаномію,“ пра урад Ластоўскага, „каторы стаіць на грунце незалежнасьці Беларусі і ўважае Раду Пяцёх за зраднікаў народных ідэалаў.“ Разумеецца, пан Гаўронскі лае ўрад Ластоўскага за „палітыку авантурнічага ідэалізму“, а Раду Пяцёх хваліць за „палітыку рассудку і ўмеркаваньня.“

У канцы-ж стацьці п. Гаўронскі крытыкуе становішча „Нашае Думкі“ па плебісцытнаму пытаньню. Зачапіўшыся за тое, што беларусы заклікаюцца „Н. Д.“ галасаваць за Літву, п. Г. шкадуе, што народ беларускі будзе падзелены паміж суседзямі. Адсюль вывад п. Гаўронскага, што „Н. Д.“ стаіць за падзел Беларусі. Сьмех дый толькі! П. Гаўронскі проці падзелу! П. Гаўронскі абвінавачывае нас! Ён чуць ня плача, што частка Беларусі не пападзе пад яго плянтатарскую палітыку. П. Гаўронскі—за незалежную ні ад каго Беларусь, апрача, разумеецца, залежнасьці ад Польшчы, з культурнай аўтаноміяй на паперы, а на дзеле без усяго.

Панскія сны, панскія міражы!

Мы верым, што разьбітае карыта не за гарамі.

Віленчук.

Усіх паважаных рэдактароў, якім пасылаецца „Наша Думка“ з напісам „абмен“, вельмі просім высылаць і нам свае выданьні.

Адраджэньне беларускага мастацтва.

Беларусы маюць ужо высока разьвітую гісторыю (Даўнар-Запольскі, Лаппо-Данілеўскі, Любаўскі), філёлёгію (акадэмік Карскі), этнаграфію (Фэдароўскі, Раманаў, Нікіфароўскі). Цэлы сьцяг навуковых прац дае нам магчымасьць прасачыць нашу палітычную гісторыю, пазнаёміцца з нашай старой літэратурай, з гісторыяй разьвіцьця нашае мовы, з народным творствам. Але, каб прадставіць сабе поўны абраз нашае старое культуры, не хватае аднаго: няма ў нас яшчэ акуратна распрацаванай гісторыі таго, ў чым найбольш ярка, бо безпасрэдна выяўляецца душа народу, — гісторыі беларускага мастацтва. Ажно дзіўна робіцца: чаму ніхто з вучоных, каторыя стараліся пранікнуць думкай да ўсіх куткоў нашага даўнага жыцьця, не задаўся ідэй даць гісторыю нашага мастацтва, каторае ў часы расьцьвету нашае культуры (ў пэрыод дзяржаўнае незалежнасьці) напэўна стаяла вельмі высока, як аб тым сьведчыць хаця-бы археолёгія, калі нам мала тэорэтычнага пераконаньня, што яно не магло не існаваць. Вось, што гаворыць аб гэтым выдатны беларускі вучоны-археолёг, с. п. Іван Луцкевіч, расьвяціўшы ўсё сваё жыцьцё архэолёгічным досьледам. З прычыны краёвай выстаўкі старажытнасьцей, якая адбылася ў 1918 годзе ў Менску, ён пісаў у беларускай часопісі „Гоман“:

„Як і ўсюды ў нас, мастацтва прыйшло да беларусаў разам з хрысьціянствам з Усходу. У першых часох хрысьціянства яно было ў нас скрозь бізантыцкае, але наплывы з Поўначы праз знамянітую тарговую дарогу „з варагаў у грэкі“ прынесьлі вялікі дадатак культуры паўночна-скандынаўскай, што выяўляецца ў узорах сярэднявяковага мастацтва.

„Каб схэматычна пазнаёміць з мясцовым стылем, трэба было-б апісаць гісторыю краёвых цэхаў, каторыя вырабялі ня толькі рэчы першае патрэбы, але і збыткоўныя кунштоўныя вырабы. Найбольш характэрна для беларускага мастацтва праца малярскага цэху, каторы разам з цэхам пазалотніцкім з даўнадаўна, бо ужо пры жыцьці сьв. княжны Еўфрасіні Полацкай (— XII ст!.. А. Н.), вырабляў артыстычныя рэчы (гл. полацкі крыж сьв. Еўфрасіні, зроблены ў Полацку). Спачатку малярскі цэх ў Полацку, Смаленску і іншых культурных цэнтрах Беларусі працаваў узіраючыся на бізантыцкія арыгіналы, але пазьней, перайшоўшы да Вільні, завязаў зносіны з Поўначчу і Заходам праз крыжакаў, праз Рыгу і Каралевец (— работы віленскіх маляроў з датаю XV сталецьця бачым у Ягелёнскай капліцы у Кракаве). Гэтыя зносіны з Заходам даюць ужо ў XV і XVI веку знамяніты рэзультат: беларускае малярства, злучаючы стара-бізантыцкія ўплывы з заходнім мастацтвам, уліяе да гэтага мясцовыя матывы ў аздобах, рэчах, опратках і асабліва, хоць і наіўныя, рысы беларускага народу, ды гэтак вытварыліся прымернікі прымітыўнай беларускай малярскай школы, — „рытай па золату“, як ясна пішуць і называюць яе старыя інвэнтары цэркваў і манастыроў (напр. слуцкіх). Гэты „куншт малярскі, па золату рыты“, дзержыцца ў беларускім цэхавым малярстве праз увесь XVII і XVIII век: у прымерніках слуцкіх абразоў з XVI і XVII вякоў, і навет у XVIII веку ў вельмі цікавых абразох з Магілеўшчыны, багата прадстаўленых у сабраньні царкоўных старажытнасьцей Магілева.

„У арнамэнтах на рызах, а также па вырабах золаткацкага цэху, ганчарных (кэраміка) і графічных бачым улюбленыя беларускія кветкі. Пазьней гэтае-ж самае сустракаем у ткацтве (хацябы слуцкія паясы!), арнамэнтах, роспісях царкоўных, у міньятурах старых эвангэлій, у фрэсках старасьвецкіх замкаў (успомню толькі Троцкі замак).

„Усё гэта дае багаты матар'ял для гісторыі беларускага мастацтва. Маладыя беларускія мастакі-артысты павінны ў гэтым, таксама як у архітэктуры—будаўніцтве цэркваў і званічак, шукаць прымернікаў дзеля новага творства; нашы маляры павінны браць усё, што ёсьць добрае і арыгінальнае ў малярскім кунштце старых беларускіх „па золату рытых“ абразоў, у творстве нашай старой Бацькаўшчыны“.

Гэтак пісаў Ів. Луцкевіч. І словы яго павінны заахвоціць да працы пад бліжэйшым вазнаньнем нашага старога мастацтва як нашых мастакоў, так і нашых вучоных. На жаль, цяперашнія ненармальныя варункі становяць вялікую перашкоду ў працы адных і другіх. З вучоных адгукнуўся толькі малады бэрлінскі архэолёг, д-р Іппэль, каторы на-

друкаваў невялічкую, але багата ілюстраваную расправу аб беларускім мастацтве ў зборніку „Weissruthenien", Berlin 1919. З мастакоў не адзваўся ніхто...

Здаецца, што падобна таму, як наша старадаўная літэратура, зжыўшыся уступіла месца новай—адраджэнскай літэратуры,—таксама на месцы старадаўнага мастацтва ў-ва ўсіх яго галінах павінна нарадзіцца новае. Аднак, апрыч краснага пісьменства, апрыч куншту драматычнага, мы як - быццам нічога больш на ніве мастацтва ня бачым. Чаму так? Чаму няма ў нас, беларусаў, мастакоў маярства, архітэктуры, разьбярства? Чаму нічога ня чуваць аб беларускім музыкальным творстве, хаця наша народная музыка—нязвычайна багата песеннымі матывамі?

Адказу на гэта трэба шукаць у варунках беларускага грамадзкага жыцьця. Беларускі пясьняр, беларускі пісьменнік ведае, што яго кніжка пойдзе шырока і глыбока ў народ і дасьць яму кусок хлеба. Беларускі тэатр можа існаваць і разьвівацца, бо беларускае грамадзянства, шырокія беларускія народныя масы патрабуюць яго таксама, як патрабуюць друкаванага слова. Адным словам: гэтыя дзьве галіны мастацтва могуць разьвівацца затым, што беларускае грамадзянства ужо у сілах іх утрымаць. Па болей мы сіл ня маем... І вось, ня гледзячы на нашае музыкальнае багацьце, наш выдатны композытар, Станіслаў Казура, высока шанаваны заграніцай, прымушаны працаваць для палякаў, як дырэктар варшаўскае консэрваторыі, хаця ўсемі сіламі сваей гарачай душы рвецца да роднай Беларусі, хаця ў творах сваіх выяўляе душу беларускага народу, сум і тугу яго зямлі, гоман яго лясоў і цішу сьмяротную яго балот... Творы Казуры—наскрозь беларускія, — аднак яны трапляюць да скарбаў польскае культурнае скарбніцы, бо беларусы яшчэ не пасьпелі разьвінуць у сябе музыкальнага жыцьця! А вазьмеце архітэктуру—будаўніцтва. Каму не знаёмы гэткі нам блізкі, родны стыль нашых старэнькіх цэркваў і званічак, нашых драўляных дамоў, сьвірнаў і т. д? Багацьце нашага будаўніцтва з дрэва напэўна ня меншае, чым багацьце так - званага „закапянскага" стылю. Аднак, мы ня прыждалі йшчэ беларускага Віткевіча, каторы распрацаваў-бы беларускі стыль, паказаў-бы ўсяму сьвету хараство яго і датарнаваў-бы асаблівасьці яго да вымогаў сучаснага будаўніцтва. Чаму? Ізноў-жа затым, што беларускае грамадзянства ня мае заможных людзей, каторыя маглі-бы будаваць сабе дамы і гэтак даць матарыяльную падставу распрацаваньню беларускага стылю. Дык і выходзіць так, што здольны беларускі мастак - архітэктар, Лявон Дубяйкоўскі, сядзіць у тэй-жа Варшаве і ўсялякімі спосабамі зарабляе на кусок хлеба, ня маючы магчымасьці аддрукаваць распрацаваныя ім ужо праекты стылёвых беларускіх дамоў—мястовых і вясковых...

Так яно робіцца ў нас і ў-ва ўсім іншым. Нашае грамадзкае жыцьцё толькі йшчэ арганізуецца, мы толькі пачынаем тварыць нацыянальнае мастацтва—і тварыць тое, дзеля чаго ўжо падгатованы грунт. Але ў меру нашага агульнага разьвіцця, ў меру ўзрастаньня духовых патрэб беларускае народнае масы, — ўрэшце, ў меру вытварэньня [illegible] матарыяльнае магчымасьці для нас [illegible] здаволіваць усе патрэбы нашага дух[illegible], прыйдзе чарод і на разьвіцьцё т[illegible] галін беларускага мастацтва, які[illegible] дагэтуль не магді прыцягнуць да с[illegible]сябе мастакоў-беларусаў, прымушаны[illegible] жыцьцём працаваць для чужых [illegible]ам народаў.

Ант. Навіна.

Павіннасьць вымагае.

Сьвятая павіннасьць кожнага з нас, ці то просты селянін, работнік альбо інтэлігент, бараніць нашу бацькаўшчыну.

У той час, як усе нашы суседзі ўжо дабіліся свае самастойнасьці й слабоды, мы адны толькі па ранейшаму застаёмся бясправўнымі парабкамі, служачы рэччу спрэчак і гандлю паміж нашымі суседзямі.

У той час, як нашы суседзі карыстаюцца дабыткамі свае слабоднае працы, мы адны толькі па ранейшаму прымушаны працаваць на сваёй зямлі невядома на каго ё за што.

Мала таго, над намі зьдзекуюцца, сьмяюцца над нашаю простаю роднаю моваю, з намі ня хочуць лічыцца як з людзьмі.

Да якога-ж часу ўсё гэта будзе цягнуцца?

Да якога-ж часу мы будзем трываць і на ўсё хладнакроўна глядзець?

Ці не пара й нам сур'ёзна падумаць аб сваёй судзьбе.

Але нішто само ў рукі ня прыдзе й ніхто нам нашае бацькаўшчыны для нас бараніць ня будзе.

Трэба самім, разам усім і кожнаму паасобку, ўзяцца за дружную працу.

Але дзеля таго, каб ўратаваць бацькаўшчыну, мала кожнаму з нас сазнаваць яе бязпраўе, хварэць за яе душою, мала стукаць усюды ў дзьверы, прасіць альбо навет крычаць аб падмозе,-застаючыся бяздзейнымі зрыцелямі падобна таму натоўпу з выпадковых праходзячых, каторы, бачачы утапаючага ў рацэ нешчаснага чалавека, бегае па берагу, уздыхае, охае, крычыць аб падмозе, але ніхто й ня думае кідацца ў ваду...

Наадварот, кожны з нас заўсёды павінен быць гатовы, раз гэтага трэбуе наш сьвяты доўг, не задумваючыся, першым кінуцца хоць-бы ў вагонь альбо ў ваду дзеля таго, каб падаць руку падмогі свайму утапаючаму брату, хоць-бы гэта стоіла нашага жыцьця.

Толькі той варт жыцьця, хто сьмерці не баіцца.

Працавалі-ж мы да гэтага часу для другіх, і дзе мы не працавалі: на палёх, у лясох, на рэках, чыгунках, фабрыках, заводах... дзе мы толькі не пралівалі поту й крыві...

Чаму-ж мы ня можам яшчэ трохі папрацавац для саміх сябе?

Умiралі-ж мы на войнах за чужыя землі, за чужую бацькаўшчыну, за чужыя інтарэсы...

Чаму-ж мы ня можам ахвяраваць сябе, калі гэтага трэбуе наш сьвяты доўг, для свае роднае бацькаўшчыны, успоенае й ускормленае нашаю працаю, потам і крывёю?

Умiралі-ж мы на барыкадах і стралалі па вастрогах за права, слабоду, роўнасьць і братэрства другіх.

Чаму-ж мы ня можам пацярпець за нашы ўласныя правы й слабоду?

Усё гэта мы ня толькі можам, але й павінны зрабіць, раз доўг гэтага патрабуе.

Але адзін у полі не ваяка, гаворыць беларуская прыказка.

У аб'яднаньні толькі моц. Мы дойдзем да свае мэты толькі тагды, калі будзем працаваць усе дружна, як адзін, і моцна трымацца ўсе за аднаго й адзін за ўсіх.

Кожны йдэальны працаўнік можа толькі тагды аддацца сваёй працы, калі ён будзе уверены, што калі ён згіне, дык яго праца не прападзе дарма, без сьлядоў, але чарговы займе яго мейсца й будзе далей працаваць, калі ён бачыць поўнае падтрыманьне з боку акружаючых. Дзеля гэтага доўг кожнага з нас, верных сыноў свае бацькаўшчыны, падтрымліваць і дапамагаць адзін аднаму, хто чым багаты й хто чым можа, маральна й матарыяльна. Доўг кожнага інтэлігэнта абавязвае ўсе свае духоўныя сілы й здольнасьці аддаць на служэньне свайму народу, духоўна бяднейшаму свайму брату. Доўг кожнага работніка й селяніна абавязвае ахвяраваць усім, чым ён можа матарыяльна для падтрыманьня свае роднае мовы, школы, газэты, культурна-прасьветных гурткоў, словам усяго таго, што вядзе нас па дарозе да асьветы, культурнаму разьвіцьцю, экономічнаму й соцыяльна-палітычнаму вызваленьню.

Мы тагды толькі можам спадзявацца на поўную пабеду праўды і таржаства слабоды, калі кожны з нас выпаўніць свой сьвяшчэнны доўг да канца.

Ш.

Лясы і нашая будучыня.

Агульны агляд лясоў да 1912 г. З даўных часаў увайшло ў звычай лічыць лясы адным з першых багацьцяў нашага краю. Яно праўда, што агульнага ляснога прастору ў Беларусі ў 2—3 разы балей, чымся ў Украіне і Ліцьве, і здавалася, што лесу нам хопіць на заўсёды.

Цяпер, калі першым варункам адраджэньня краю ёсьць яго аканамічнае адраджэньне, мы мусім добра прыглядзіцца і да нашае лясное гаспадаркі.

Бяручы за аснову мову лічбаў ці статыстычныя лікі, бо, як кажуць, „лічбы кіруюць сьветам"—разглядзім і нашае пытаньне.

Наўперад зьвернемся да кожнае губэрні паасобку.

НАЗОЎ ГУБ.	Колькасьць лясоў у дзесяцінах 1887	1912	Агульны лік зямлі	Процэнт лясістасьці
Віленская — — — — — —	1.009.000	928.000	3.836.000	24,2 проц.
Горадзенская — — — — —	927.000	751.000	3.531.000	21,3 „
Менская — — — — — —	3.562.000	2.743.000	8.431.000	32,5 „
Магілеўская — — — — —	1.550.000	1.034.000	4.190.000	24,6 „
Віцебская — — — — — —	1.330.000	1.218.000	3.815.000	32,0 „
Усяго — —	8.378.000	6.674.000	23.803.000	—

З гэтае табліцы бачым, што агульная лічба лясоў у 1912 г. была 6.674.000 дзесяцін, у сярэднім 28 проц. усяго зямельнага прастору, які займаюць гэныя губэрні. Адгэтуль так сама бачым, што за апошнія 25 гадоў высечана 1.703.000 дзесяцін лесу.

Палажэньне лясоў ад 1912-1914 г. Гады 1912, 13 і пачатак 1914 г. адзначыліся ў жыцьці эканаміцкім вялізарнаю ляснаю спэкуляцыяй. Тады першае месца займаў вываз лясное сырызны ў Эўропу, а балей за ўсё ў Нямеччыну.

Ужо пачынаючы з 1912 г. лясная гаспадарка, дагэтуль кволая, зусім паміраець, сякуць сотні і тысячы соцен дзесяцін.

Узьнялася сусьветная вайна, застагнала маці зямелька, а з ёю разам і нашыя спрадвечныя бары і адгэтуль пачаўся праўдзівы рабунак лясоў. Сякуць і губяць дзеля розных ці на фортыфікацыю, ці „дзеля стратэгічных мэт" (асабліва маскоўскае войска) і бачым, што ў 1918 г. агульная высечанага лесу ў Беларусі і Літве даходзіць да 390.000 дзесяцін.

1913 высечана 25.000 дзес.
1914 — 50.000 „
1915 — 85.000 „
1916 — 95.000 „
1917 — 85.000 „
1918 — 60.000 „

Адгэтуль мы бачым, што найвялікшая лічба прыходзіцца на 1915 16, і 17 гады, што тлумачыцца агульнаю палітыкаю немцаў акупантаў захапіць і выцісьнуць усё, што толькі можна ад заваяваных.

Нямецкая гаспадарка і лясныя пажары. Трэба зацеміць яшчэ, што гэтыя лічбы балей малыя, чымся вялікія, бо ў гэтую лічбу не ўвайшло сотні тысяч дзесяцін змарнаваных немцамі лясоў, якія гналі смалу з жывога лесу, а яшчэ гэныя вялізарныя лясныя пажары—усё разам пэўна-ж шмат перавысіць лічбу 390 тыс. дзес. Гэткі агульны абраз лясное гаспадаркі ў Беларусі ў цяперашнюю часіну.

Колькі трэба дрэва ў Беларусі. Цяпер пяройдзем да агляду колькі патрэбна лесу што год для самых жыхараў нашага краю. Тутака мусім адцеміць, што возьмем лік жыхараў, які даець статыстыка 1912 года, хоць запраўды шмат людзей, выгнаных з родных кутоў вайною, засталося па чужыне, ня меней згінула ад пошасьцей і голаду, але ўсё-ж такі нашая старонка была і ё зонаю фронту, дзе концэнтравалася некалькі мiлiённая армія.

Патрэба дрэва на кожнага чалавека. Пры вылічэньні патрэбы дрэва для жыхараў краю, прымаюць пад увагу культуру, аканаміцкі быт данае старонкі, характар будоўляў. Для Беларусі вылічаюць гэтую патрэбу ў 0,4 куб. саж. на кожнага чалавека ў год.

Годні прырост лесу на адну дзес. 0,4. Далей годні лясны прырост вылічаюць так сама ў 0,4 куб. саж. на кожную дзесяціну. Маючы ўсе гэтыя даныя можам зрабіць годні лясны баланс.

ГУБЭРНІ	Колькасьць людзей	Колькасьць лесу ў дзес. у 1920 г.	Прырост у год куб. сажн.	Патрэба дроў у куб сажн. у год	Нястача куб. сажн.
Віленская — — —	2.075.900	863.000	345.000	830.360	485.160
Горадзенская — — —	2.048.200	686.000	274.400	819.280	544.880
Менская — — —	3.035.800	2.678.000	1.071.200	1.214.200	143.000
Магілеўская — — —	2.465.000	1.008.000	403.200	986.000	582.800
Віцебская — — —	1.953.100	1.192.000	476.800	781.240	304.400
Усяго — —	11.578.000	6.427.000	2.570.080	4.632.120	2.060.240

Агульная патрэба дрэва на адзін год. З гэтае табліцы бачым, што годняя патрэба дрэва жыхарам краю роўная 2.060.240 куб. сажн. Калі перавядзем гэтую лічбу на дзесяціны, дык будзе 185.285 дзес. патрэба выразаць што год, каб здаволіць нашую патрэбу дрэва.

Сучасны крызіс лясное гаспадаркі. А значыцца ўсяго ляснога багацьця нам можа хапіць ня болей як на паўвеку. Бяручы пад увагу ўсё вышэйказанае, мы бачым, што блізка тая часіна, калі мы можам зрабіцца банкротамі, што калі лясная гаспадарка і далей пойдзе гэтаю цуцявінкаю, то аканаміцкае жыцьцё прыпрысуджана на сьмерць, а за ім і ўся нашая будучына.

Тарпавіна. Дзеля гэтага мусім зьвярнуць нашую пільную ўвагу, каб знайсьці выхад з цяжкага крызысу. Наўперад уздымаецца пытаньне: ці можна замяніць дровы чым-небудзь іншым, а калі можна, то чым ляпей для нашага краю.

Колькасьць торпу і тарпавіны. Ні вугальля, ні карасіны мы ня маем, але затое Беларусь маець вялізарнае багацьце—тарпавіну. Ведама, што 1 куб. сажань лесу раўняецца 300 п. торпу. Цяпер цікава даведацца, які лік мы маем торпу, колькі годнага на апал і якому гэта раўняецца ліку куб. саж. дрэва. Будзе гэткая табліца:

Магчымасьць пакрыць лясны дэфіцыт і палепшыць аканаміцкае жыцьцё. Адгэтуль мы бачым, што нашая бацькаўшчына маець вялізманнае багацьце, якое можа ня толькі пакрываць наш лясны дэфіцыт, але яшчэ павінна палепшыць нашае аканаміцкае жыцьцё. Трэба яшчэ зацеміць, што тарпавіны яшчэ мала дасьледжаныя і ёсьць пеўнасьць, што іх маем шмат болей, чымся ведаем дагэтуль,

Слабое разрабленьне торпу. Яго будучыня. Разрабленьне торпу ў Беларусі зусім яшчэ малое, а ў вайну блізу таго

25-га сакавіка г.г. будзе тры гады з часу абвешчаньня Беларусі незалежнай рэспублікаю (25.III—1918 г.)

Па местах, мястэчках і весях, удаму і на чужыне рыхтуйцеся к вялікаму сьвяту.

нітo памёрла. Пэўне-ж торп ніколі мусіць ня стане прадметам нашага вывазу

Губэрні	Колькасьць дзесяцін тарпавіны	Колькасьць пудоў торпу згоднага на апал.	Раўназначная колькасьць куб. сажн. лесу	Раўназначная колькасьць дзес. лесу
Віленская — — —	450.000	56.700.000.000	189.000.000	4.795.000
Гараdзенская — — —	494.000	53.674.000.000	178.080.000	4.452.000
Менская — — —	1.200.000	1.512.000.000.000	504.000.000	12.600.000
Магілеўская — — —	656.000	82.656.000.000	275.820.000	6.888.000
Віцебская — — —	680.000	82.686.000.000	285.600.000	7.140.000
Усяго — — —	3.410.000	1.787.716.000.000	1.433.000.000	35.805.000

заграніцу, але гэта вялізарная аканомія для апалу.

Алёна Дубіцкая.

(Канчатак будзе).

Рэформа школы у галоўнейшых культурных краех і працоўны мэтод у выкладаньні фізыкі.

(Гл. №-9).

Другое цячэньне сучаснае педагагічнае думкі можа быць названа утылітарным. Яго сутнасьць выражана ў гэткіх словах вялікага фізыка і педагога Алівера Лоджа: „Усякае абвучэньне павінна даводзіць да такой ступені, каб яно магло даць карыснае веданьне, прыкладовае (прымянімае) да жыцьця; а карысным ёсьць усякае веданьне, павялічываючае работаздольнасьць свайго ўласьніка.“ Выдатным прадстаўніком гэтага кірунку ў Расеі зьяўляецца В. Лермантаў, прыват-дацэнт Петраградзкага унівэрсітэта. Па яго думках, сучасны школьны лад вядзе свой пачатак ад Арыстоцеля, каторы лічыў патрэбным абвучаць слабоднага грэцкага дзяцюка усяму таму, што ухарашае жыцьцё, й абходзіць усё практычнае рамесьленае, бо гэта вудзел рабоў і ілотаў. Такім чынам у часы Арыстоцеля школы адчыняліся толькі дзеля слабоднае моладзі. Такое становішча школы цягнулася цэлыя вякі. Настала хрысьціянства, мінуліся сярэднія вякі, эпоха адраджэньня, а ў школе ў сутнасьці нічога не зьмянілася. Асьвету ў ёй паранейшаму даставалі дзеці пануючых заможных клясаў.

Эстычна-гімнастычныя прадметы абвучэньня грэцкае школы зьмяніліся другімі прадметамі, скіраванымі к дасяганьню разьвіцьця розуму і надворнага лоску дзяцей. Але імкненьне ухаваць вучняў ад усяго практычна-рамесьленага заставалася ў поўнай сіле. Выключэньне было зроблена толькі на карысьць уменьня чытаць, пісаць і лічыць, бо гэтыя ўменьні былі прызнаны патрэбнымі для ўсякага вучонага чалавека. Такая будова школы зусім адпавядала аж да XVIII века тагдышнему становішчу грамадзянства. У школах абвучаліся толькі дзеці такіх клясаў, каторыя ганьбавалі усякаю працаю, апроч вайсковае й адміністрацыйнае. Дзяцей-жа ілотаў і рабоў ніхто, апроч бацькоў, ня вучыў, а спосабу працы яны абвучаліся, памагаючы старэйшым. Так справа цягнулася да паловы XVIII в., калі была выдумана паравая машына, і калі навукі аб прыродзе сталі распрацоўвацца, а рэзультаты іх паступова знаходзілі прымяненьне ў жыцьцёвай практыцы. Але дзеля ўдачнага прымяненьня рэзультатаў навукі патрэбна ведаць хоць да некаторае ступені гэтую навуку.

Дзеля гэтага іх сталі ўводзіць у школы, зьявіліся асобныя сьпецыяльныя, тэхнічныя школы, а прасьвета стала патрэбнаю ня толькі для пануючых клясаў, але й для працоўных. Апроч таго патрохі стаў прападаць з жыцьцёвага абыходу, а значыцца і з школы, тып слабоднага хлапца грэцкага, а на зьмену яму прыйшлі патомкі мінулых ілотаў і рабоў. Гэтым патрэбна было атрымаць ад школы веданьне і ўменьне, прыкладовыя ў жыцьці, каторыя-б давалі магчымасьць з часам зарабляць дзённую ежу, а гэтак-жа дастаць балей высокую ступень матар'яльнага дабра. Падобным вучням ужо не да „хараства жыцьця“, ім трэба падтрымаць гэта самае жыцьцё. Педагогі не заўважылі гэтае перамены складу вучняў і зьяўленьня зусім новых запросаў у школе. Яны павялічылі толькі лік выкладаных прадметаў, стварыўшы ў школе праславутую многапрадметнасьць, але не зьмянілі сутнасьці вучэбнае справы, а прадаўжалі паранейшаму выкладаць асновы навук, адкідаючы ўсе проста прыданыя ў жыцьці вывады іх, як нешта рамесьленае, утылітарнае, зусім не падхадзячае для агульна-асьвятовае школы. Дзякуючы гэтаму, вучэньне стала труднейшым; яно аказалася непасільным для балей слабых, а ад выкладаньня нова-ўведзеных у школьную праграму новых навук ніякіх відочных рэзультатаў не аказалася.

Другая памылка ў школьнай справе ёсьць у тым, што пастаўленая школаю мэта „разьвіцьце розуму вучняў“, ці ўменьне разважаць і прыкладаць да прыватных выпадкаў звычайнага жыцьця веданьне асноваў усіх навук і ўменьне скора прыпараўлівацца да ўсякае справы, прызвычаенае усякаму інтэлігэнтнаму чалавеку сучаснага грамадзянства, што гэта мэта недаступна для простых людзей. На гэта паказаў у 1914 г. праф. Армстрот, старшыня сэкцыі педагогікі Брытанскае Асоцыяцыі ў такіх словах: „Галоўная памылка педагогаў у тым, што яны хочуць зрабіць з усіх інтэлігэнтаў, тагды як да гэтага здольны толькі не балей за аднаго з 1000“, рэшту-ж 999 можна толькі абвучыць рабіць па паказанаму, а не сваім розумам. Гэтакія-ж самыя і саракагадовыя дасьледы В. Лермантава над балей чым 5000 студэнтаў, прайшоўшых пад яго кіраўніцтвам праз фізычную лабараторыю Петраградскага унівэрсітэта. Па думцы Лермантава „толькі вельмі нямногія здольны мысьліць самастойна, на падставе вытлумачаных ім асноваў навукі. Большасьць можа толькі вывучыцца працаваць і разважаць па паказаных правілах і схэмах, а рэшта могуць здолець толькі адну вузкую сьпецыяльнасьць знаньняў, хоць часта здольны дайсьці ў ёй высокай ступені ўсьпеха.“ Сучасная школа збудавана толькі для дзяцей першага разраду здольнасьцяй, а для рэшты яна непасільна.

Трэба зьмяніць кірунак і мэту выкладаньня, каб школа фактычна зрабілася даступнаю для ўсіх. Аб новых мэтах школы ясна гаворыць праф. Джон Пэрры, вядомы рэфарматар выкладаньня элемэнтарнай матэматыкі: „Сучасны дзяцюк мае права вымагаць ад школы, каб яна выўчыла яго дасьледжываць, рабіць рахункі па мэтадах матэматыкі й вычытываць з кніжак патрэбныя ведамасьці, калі ў гэтым здарыцца патрэба.“ Сходныя думкі выказаў Д. Мендзелееў у „Асновах прамышленнасьці“: „Сучаснаму чалавеку трэба ведаць трохі аб усім і, па магчымасьці, усё вядомае аб чым-небудзь нямногім, выбраным сваёю сьпецыяльнасьцю.“ Такім чынам, згодна з гэтым паглядам павінна быць абмяжована вобласьць выкладанага ў школе толькі карысным для жыцьця, апроч таго павінен быць зьменен парадак і прыёмы абвучэньня: усе вучні ў першую чаргу павінны ізучыць прыкладаньне навукі да жыцьця, а затым толькі балей разьвітыя й балей здольныя з дзяцей могуць пачынаць ізучэньне саміх навук.

(Працяг будзе.)

А. Дмахоўскі.

Узьбіліся на свой шлях.*)

Такім чынам вайсковая тройка залажыла за тры дні першую Слуцкую брыгаду стральцоў войск Беларускай Народнай Рэспублікі.

Трыста карабінаў дасталі збоку і сот пяць стрэльбаў жаўнеры прынесьлі з дому. У гэты час, 24 лістапада, польскае войска на аснове дагавору ў Рызе пакінула места Слуцак. Беларуская брыгада, дзякуючы таму, што яшчэ не ўпарадкавалася, як належыць, прымушана была адайсьці з м. Слуцка ў мястэчка Семяжова. Разам з брыгадаю выехала й Рада Случчыны.

У мястэчку Семяжове брыгада арганізавала два палкі: 1-Слуцкі й 2-Гроза скі. Цяжка апісаць гэты адход беларускіх войск з Слуцка. Уся шаша на працягу трыццацех пяцёх вёрст была пакрыта кучамі маладых людзей з мяшкамі за плячамі, уцякаючых ад маскоўцаў да беларускага войска. Так праз тыдзень у 1-Слуцкай брыгадзе стала сем тысяч жаўнераў, а стрэльбаў толькі восем соцен. Аднак, ня гледзячы на брак аружжа, брыгада заняла пазыцыю на працягу шэсьцьдзесят вёрст. Але, калі трымаць войска, то трэба яго й карміць. Рада Случчыны разаслала агентаў па ўсёй мясцовасьці, пад'уладнай ёй, зьбіраць ежу для войска. Рэквізыцый не рабілі, а зьбіралі толькі ахвяры. І вось кожны дзень ахвяр на склад прывозілася да семдзесят пудоў хлеба й да дваццацёх пудоў мяса, не гаворачы ўжо пра іншыя харчы. Справа йшла надта добра. Першая спатычка з маскоўцкамі была ў м. Капылі, дзе беларусы захапілі ў палон маскоўскі Рэўком і цэлую роту маскоўскіх чырвонаармейцаў з канцылярыяй і усёю амуніцыяй. Тут аднаго беларускага жаўнера цяжка ранілі, так што пажыў толькі адны суткі й памёр. Родам ён з м. Старобіна — Валодзька Пiліп. Гэта была першая ахвяра за незалежнасьць бацькаўшчыны. У гэты час ужо былі ў брыгадзе прысланыя беларускія афіцэры, паміж іншымі майор А. Якубецкі, які крыху пазьней заняў пасаду Камандуючага беларускімі войскамі, і капітан Борык, які быў шэфам штаба брыгады. Вось 30-га лістапада ў Семяжоўскай царкве адбылася панахвіда па забітым жаўнеру. Царква была паўнютка людзей, ва ўсіх у руках гарэлі сьвечкі й многія сяляне горка плакалі. Вынасілі цела з царквы пад гукі музыкі хаўтурнага маршу. Прад спусканьнем нябожчыка ў магілу былі сказаны чатыры прамовы. Потым далі тры залпы й насыпалі курган. Па нябожчыку паставілі крыж, на якім павесілі тры вянкі й сьцяг з надпісам: „Ты памёр, а памяць аб табе ў сэрцах беларускіх жыць будзе вякі“ — „Першая Слуцкая брыгада войск Беларускае Народнае Рэспублікі“. Яшчэ заўважу, што пахавалі гэтую першую ахвяру ля Семяжоўскае царквы ўпоравень з магіламі пахаваных там духаўнікоў.

Потым пачаліся вялікія баі з маскоўцамі ў розных мясцох, але заўсёды былі удачны для беларусаў. Палонныя казалі, што маскоўцы спачатку ня ведалі, хто мы такія, а лічылі нас балахоўцамі. Здавалася-б справа йшла добра, але-ж не, прыйшлося атрымаць вялікую няўдачу.

Камандзер 1-га Слуцкага палка аказаўся здраднікам бацькаўшчыне. Гэта быў капітан Чайка, быўшы „Ваянрук“. Ён знайшоў аднаго дзядка гадоў семдзесят, даў яму ліст да маскоўцаў, каб той занёс у іхны штаб. Але гэтаму дзядку не ўдалося прайсьці, яго на фронце затрымалі патрулі й знайшлі гэты ліст. У гэтым лісту капітан Чайка апісаў усе недахваты беларускага войска. Значыцца, каб гэта яму удалося, дык ў адзін-бы ня добры час уся беларуская арганізацыя папала-бы чорту ў зубы. Гэтага камандзера зарыштавалі й аддалі ў контр-разьведку. Начальнікам контр-разьведкі быў паручнік Мірановіч, добры прыяцель капітана Чайкі. Паручнік Мірановіч, бачачы, што жаўнеры вымагаюць сьмерці прадаўцы Чайкі, паставіў справу так, што Чайка ўцек. Рада Случчыны заразжа зрабіла „Надзвычайны патаемны сход“ і вынесла пастанову зарыштаваць Камандзера брыгады капітана Анцыповіча за халодныя адносіны да вайсковых тайнаў і паручніка Мірановіча за ўцёкі Чайкі, а на іх месца назначыла другіх афіцэраў: Камандзерам брыгады капітана Сокала-Кутылоўскага, чалавека вельмі праўдзівага, якому й дала часова права дыктатарскае ўлады, начальнікам контр-разьведкі паручкіка Янушэнка, а камандзерам 1-га палка падпалкоўніка Гаўрыловіча. Пры тым зарыштаваных аддалі пад Ваенна-палявы суд, старшынёю якога быў сябра Рады Б. Вядома, па суду зарыштаваныя афіцэры атрымалі толькі судзебны выгавар.

Назаўтрае, пасьля таго, як уцёк Чайка, маскоўцы павялі наступленьне на ўсім нашым фронце. Беларускае войска прымушана было адступіць з м. Семяжова на захад восем вёрст. Трэба яшчэ заўважыць, што да таго часу, пакуль быў Чайка, ўсіх палонных адпускалі на волю, але мала йх назад ішло да маскоўцаў, а заставаліся ў беларускім войску. Потым, калі там ужо ў маскоўцаў быў капітан Чайка, да беларускага штабу даляцела вестка аб пяцёх беларускіх разьведчыках, папаўшыхся да маскоўцаў у палон, якім там адрэзалі нос і вушы й вазілі па вёсках на паказ. Пасьля гэтага беларусы палонных на волю ня пускалі. Бывалі выпадкі такія, што палонны маскоўскі чырвонаармеец, якога пусьцілі на волю, ішоў назад у свой полк, падгаварваў болей таварышоў, абакрадвалі амуніцыю й аружжа ў сваіх ротах і пераносілі да беларускага войска. Такіх выпадкаў было ня мала. Гэта радавалася датуль, пакуль на бальшавіцкім фронце былі й чырвонаармейцы-беларусы, а ня толькі адны маскоўцы,— мешаніна. Але бальшавікі заўважылі гэта й прыслалі на наш фронт татараў, кіргізаў. Тут ужо справы пагоршалі. У гэты час беларускае войска атрымала трыста стрэльбаў, адзін кулямёт Максіма й два Кольтоўскіх ў Луніпцы,—да сваё аружжа, — так што ужо ўсяго разам сабралася да дзьвёх

*) Гл. № 10 „Н. Д.“

тысяч стрэльбаў і да дзесяцёх кулямётаў. Беларускае войска, пасьля гэтага ня вытрывала й павяло наступленьне на мястэчкі Семяжова й Вызну. Наступаць на мястэчка Семяжова згадзіўся йсьці паручнік Міравовіч з кавалярыйскім аддзелам, а капітан Самусевіч з пешым аддзелам. Зайшлі яны да вёскі Новыя-Макраны й застанавіліся начаваць, бо яны рыхтаваліся напасьці на маскоўцаў раніцаю. Вось ноччу ў гэтых Новых-Макранах здарыўся такі выпадак. У конным аддзеле тады служылі два вядомыя на Случчыне бандыты: Мірончык з вёскі Ячава, Слуцкае воласьці й павету, і другі, прозьвішча ня помню, з Шацкае воласьці Ігуменскага павету. У гэту ноч яны задумалі крыху нажыцца. Падгаварылі яны больш сабе кумпаньёнаў і ўкралі дзесяцера коней у сялян тае вёскі, шмат палацён, бялізны, сала й наагул забралі ўсе, што папалася ім у рукі. Забраўшы ўсе гэта, яны зьвярнуліся назад, не пашлі, значыцца, з другімі ў наступленьне, і думалі што будзе ўсё крыта. Раніцаю дайшла вестка аб гэтым да штабу й усіх гэтых грабежнікаў зарыштавалі, а разам з імі й паручніка Мірановіча за тое, што ён не зьвярнуў увагі на сваіх падданых у час грабяжу. Камандзэр брыгады дыктатарскаю ўладаю разжалаваў паручніка Мірановіча ў шарагоўцы, а двух бандытаў загадаў расстраляць. Расстрэльвалі їх публічна а другой гадзіне папаўдні 14-га сьнежня ў глінішчах ля вёскі Грыцэвічы, у якой стаяў штаб Беларускіх войск. Праз суткі пасьля гэтага аддзел пад камандаю капітана Самусевіча, падмацованы ротамі, якія стаялі па пазыцыі, выгнаў маскоўцаў з мястэчка Семяжова, адабраўшы ў іх кухню, трое каней, кулямёт, дваццаць стрэльбаў і семдзесят пудоў збожжа. Штат брыгады тады павінен быў пераехаць з вёскі Грыцэвіч бліжэй да фронту, але глыбей на Палесь, у вялізную вёску Морач. Адсюль ужо былі пасланы лепшыя сілы на мястэка Вызну. Вызна была занята беларусамі, дзе маскоўцы страцілі шмат забітымі й раненымі й сто сорак папалася да беларусаў у палон. Гэта быў адзін з найбольшых баёў беларускіх паўстанцаў з маскоўцамі. Значыцца, абодва мястэчкі засталіся ў руках Слуцкіх паўстанцаў, толькі ня прыйшлося ў іх доўга пастаяць, бо, як вядома, Іофэ ў Рызе на ганфэрэнцыі дастаў дазвол увесьці чырвоныя войскі ў нейтральны пас на 72 гадзіны дзеля таго, каб выгнаць адтуль паўстанцаў. Тады маскоўцы прыслалі на фронт тры дывізіі войск, якія складаліся з людзей жоўтаскурых. Павялі яны наступленьне па ўсім фронце, так што паўстанцы адначасна аддалі ім м. Семежава й Вызну. У м. Вызне быўшы паручнік Мірановіч, апраўдаў сябе. Яго маскоўцы абкружылі, але ён адзін сярод іх пусьціўся на хітрыкі. Наляцеўшы на камандзера маскоўскае роты, ён адразу ложаю разьбіў яму галаў, маскоўцы рассыпаліся ва ўсе бакі, а ён тым часам уцёк да сваіх. За гэта Мірановічу было вернена яго афіцэрства. Пры адступленьні ад м. Семежава быў такі выпадак: адзін жаўнер-паўстанец утаміўся ўцякаючы: тады паварочваецца ён да маскоўцоў і пяе: „Ац-ве-ку мы спа-лі"... і ў гэты час страляе, адходзячыся задам. Такім чынам штаб беларускіх войск пераехаў з вёскі Морач у в. Заастравечча, а жаўнеры ня трымалі ўжо фронту, а бяз усякага парадку йшлі ўсьлед за штабам. Такім чынам, Слуцкія паўстанцы папалі ў польскі нейтральны пас, у якім палякі забаранілі зьбіраць ахвяру. Значыцца, становішча саўсім дрэннае: біцца з маскоўцамі ўжо не магчыма, бо, пасьля такіх няўдач, упаў дух у жаўнераў, карміцца няма чым, і шмат другіх няпрыемнасьцяў. Рада Случчыны, параіўшыся з вайсковымі, рашыла перайсьці па польскую тэрыторыю. У гэты час першы Слуцкі полк атрымаў палкавы сьцяг (знамя), які каштаваў 156000 польскіх марак. Вось 23 сьнежня паўстанцы Случчыны перайшлі польскую мяжу. Палякі на мосьце разброілі ўсё войска. Выходзіць так, што ўсе беларускае войска інтэрнавана. Але-ж слова „войска" шырокае: у войску можа быць пяцьсот жаўнераў, а можа быць і колькі мільёнаў. Брыгада выдзяліла з свайго складу да дзесяцёх партыяў, узброіла іх і адаслала ў глыбокі тыл маскоўцаў, а рэшта войска засталася інтэрнаванаю пад ведаю 41-польскага палка. Рада Случчыны пераехала ў м. Баранавічы, дзе й сядзела праз цэлы месяц бяз жаднае працы. Працаваць яна не магла, бо ня было ніадкуль падмогі з боку катарыяльнага. За гэты месяц шмат прыйшлося чаго няпрыемнага перажыць ад агентаў гэнарала Булак-Балаховіча, якія стараліся, каб перацягнуць да „Бацькі", але ім няўдалося гэтага зрабіць. На абяцанкі Балаховіча ні адзін паўстанец не згадзіўся, й войска, як было беларускім, так і засталося. Вось 20 студня 1921 г. на пасяджэньні частка сяброў Рады Случчыны прызнала сваім важаком Балаховіча й паехала да яго. Другая частка Рады прымушана была распаўзьціся хто куды: некаторыя засталіся ў Баранавічах, трохі паехала да Вільні, каб часова знайсьці прытулак, і такім чынам Рада Случчыны фактычна ня існуе. Інтэрнаваную частку брыгады з штабамі палкоў палякі 23 сьнежня завезьлі ў м. Беласток у кантрацыйны лагер. Там небаракі паўстанцы—Слуцакі, першыя на ўсёй Беларусі падняўшыя сьцяг ўзброенае барацьбы за незалежнасьць бацькаўшчыны, сядзяць цяпер паўгалодныя, босыя, голыя, у адных трамцях. Ня гледзечы на свой марны лёс, яны цешацца, што зрабілі вялікую працу, якая будзе залічана ў будучыне. Жывуць яны аднэю надзеяю на тое, што Беларусь ня згіне, што Беларусь васкрэсьне.

Ю. Лістапад.

Вясна.

З кожнай хмарачкі ў небе празрыстым,
З кожнай лужынкі сьветлай і чыстай
Усьміхаецца ясна вясна!
Вабяць ласкай нябесныя далі,
Ручаі звон і грукат падынялі,
Гэта-ж, праўда, падходзіць вясна!
Сьнег ляжыць яшчэ шэры і брудны
Пад узгоркам, а вецер марудны
Ужо шуміць у галінках кустоў.
Абсыхаюць у садзе дарожкі,
А маленькія яблынак рожкі
Нібы рвуцца да сонца лучоў!
Сэрца б'ецца трывожна, няроўна,
Мне і сумна, й вясёла-чароўна,
Вусны ціха шапочуць: „вясна!"
Што-сьці новае просіцца, йрвецца,
Усё сягоньня зрабіла б, здаецца,
Бо запраўды-ж падходзіць вясна!

Натальля Арсеньнева.

Вільня 1921 г.

Беларусы у Лізе Народау.

Коуня, 8 сакавіка (Эльта). Беларускае прэсбюро паведамляе аб ад'езьдзе у Парыж грам. Грыневіча, міністра юстыцыі Незалежнае Беларускае Рэспублікі, які разам з нахадзячымся ужо цяпер у Парыжы беларускім міністрам заграпічных спрау Ладновым увойдзе у склад беларускае дэлегацыі. Беларуская дэлегацыя будзе працаваць разам з літоускай дэлегацыяй пры Радзе Лігі Народау у часе разгляду пытаньня аб плебісцыту у Віленшчыне і Горадзеншчыне.

Беларускі Установчы Сойм у Віцебску.

Баранавічы, *9 сакавіка (О). Беларускія паустанцы, к якім прылучыліся многія часткі чырвонае арміі, абвесьцілі Беларускую Народную Рэспубліку, Установчы Сойм якой зьбярэцца у Віцебску.*

Паустаньне у Віцебшчыне.

У № 174 „Виленскаго Слова" надрукована: „Вільня, 11 сакавіка. Прыезныя з Віцебска паведамляюць, што места і павет ахоплены паустаньнем. Страляніна ня сьціхае. Мірныя жыхары ад страху уцякаюць. На вуліцах барыкады."

„Беларускае Слова" пад судом.

(Ад нашага карэспандэнта).

Горадня, 13 сакавіка Рэдактар газэты „Беларускае Слова" Ул. Шалешка за пярэдрук артыкулу „Адна вера, ды не адзін народ" з віленскае газэты „Наша Ніва" (№ 4) прыцягчены да адказу па 129 артыкулу. Акт аскаржэньня рэдактару Ул. Шалешка ўжо ўручаны.

Закрыцьце беларускіх школ.

(Ад нашага карэспандэнта)

Горадня, 13 сакавіка. У вёсках Рамуцяўцы і Струках, Горадзенскага павету, па загаду школьнага інспэктара, жандары зачынілі беларускія школы. Вучыцялём дадзен загад, каб у працягу 24 гадзін пакінулі гэтыя вёскі.

Школы гэтыя былі на коштах беларускага насяленьня, бо на адкрыцьце ўрадовых школ людзі страцілі надзею.

ШТОДЗЕННЫЯ ВЕСТКІ.

Чацьвер, 10 *сакавіка 1921 г.*

Антанта і Нямеччына. Аг. Рэйтэра вяшчуе на 10 сакавіка пачатак ваенных апэрацый супроць Нямеччыны за яе нязгоду споўніць вымогі хаўрусьнікаў на Лёнданскай канфэрэнцыі. Генерал Фош дастаў ужо належныя загады.

Вымогі хаурусьнікау ад Нямеччыны. Хаўрусьнікі, з папачынку Лойд-Джорджа, улажылі новы праект пәквітаваньняў ваенных страт, дабіваючыся ад Нямеччыны 30 гадавых узносаў па 3 міліярды марак золатам і падвышэньня аплаты вываза на 30 процэнтаў. Нямеччына ня ўступае, перагаворы спынены.

Паустаньне супроць саветау. З Нямеччыны паведамляюць, што быццам савецкае войска бомбардыруе работніцкія кварталы ў Маскве.

— З Рыгі пушчаюць пагалоску аб арышце паўстанцамі Зіноўева і Калініна.

— Стуль-жа паведамляюць аб паўстаньнях сялян у губэрнях: Арлоўскай, Харкаўскай, Саратаўскай і Калужскай. Чакаецца паўстаньне ў Пскове.

— Кранштадт і флот знаходзіцца ў руках паўстанцаў.

Парцэляцыя дварау у Лацьвіі. Латышскае міністэрства земляробства стварыла з раздробленых дагэтуль двароў 10.000 меншых гаспадарак.

Непарадкі у Трыесьце. Бойкі між нацыяналістамі і камуністамі у Трыесьце ня сьціхаюць. Камуністы напалілі докі, а нацыяналісты затое разбурылі дом прафэсіянальных хаўрусаў.

Пятніца, 11 *сакавіка 1921 г.*

Антанта і Нямеччына. *Бэрлін*, 9 сакавіка (О.). Нямецкі ўрад, з прычыны мер, узятых супроць Нямеччыны хаўрусьнікамі, паклікаў назад з Парыжу, Лёндана і Брусэля сваіх прадстаўнікоў. Такім чынам дыплёматычныя зносіны між Нямеччынай і хаўрусьнікамі пярэрваны.

— Ангельскія войскі дасталі загад аб адпраўцы ў Нямеччыну.

— Першыя францускія аддзелы ўступілі ў Нямеччыну на бранявых аўтомобілях.

— 8 сакавіка ў 7 гадзін раніцы акупацыйныя войскі забралі Дусельдорф. У дзень 8-га занялі басэйн Руры. 9-га раніцаю бяльгійцы занялі Дульсбург. Ходзяць чуткі, што ангельцы забяруць Франкфурт.

Паустаньне супроць саветау. З Рыгі паведамляюць з украінскага прэсбюро, што Пецярбург ужо ў руках паўстанцаў.

— Польская агенцыя „Е. Е." дае вестку, што аддзелы паўстанцаў забралі Пскоў.

— Кранштацкім паўстанцам даюць помач прадуктамі расейскія эмігранты.

Субота, 12 *сакавіка* 1921 *г.*

Паустаньне супроць саветау. У Выбарг прыйшлі весткі, што амаль ня ўвесь Пецярбург у руках паўстанцаў.

— Польскае агенцтва „Е. Е." дае вестку з Гэльсінгфорсу, што паўстанцы нібы-та робяць атакі на Крэмль у Маскве, дзе заселі латышы, кітайцы і башкіры.

— Тое-ж агенцтва дае вестку з Бухарэсту, што ў Кіеве ўлада перайшла ў рукі супроць-бальшавіцкага камітэту, што лінія Кіеў—Харкаў перарвана, а ў губэрнях Харкаўскай і Кацярынаслаўскай выбухнулі йзноў сялянскія паўстаньні і што ў Адэсе ідуць на вуліцах гарачыя бойкі паўстанцаў з бальшавікамі.

Нямеччына. У акупаваных мясцовасьцях Нямеччыны абвешчан стан абляжэньня. Уведзена цэнзура тэлеграм.

— Д-р Сімонс вярнуўся з Лёндана ў Бэрлін.

— Нямецкія газэты горка нараkаюць на новага амэрыканскага прэзыдэнта Гардынга, на падмогу якога Нямеччына разьлічала да астатняга мамэнта.

Польшча. У Пазнані засуджаны на сьмерць за растрату афіцэр і ўрадовец (чыноўнік) і за грабежства 7 жаўнераў.

Непарадкі у Трыесьце спынены. Места моцна пацярпела. Камуністы спалілі віллы заможнейшых грамадзян. Абвешчан ваенны стан. Забастоўка скончылася. Ахфяры яшчэ ня зьлічаны.

Гішпанія. Тэрорысты забілі галоўнага міністра.

Нядзеля, 13 сакавіка 1921 *г.*

Эстонія прызнала Літву дэ юрэ. *З Коўні паведамляюць, што літоўскае міністэрства заграніічных спраў дастала тэлеграму ад прадстаўніка Літвы у Рэвелю з афіцыяльным паведамленьнем аб прызнаньні Эстоніяй Літвы дэ юрэ (па праву). Эстонская нота вкладзена у самых сардэчных сказах.*

Польшча і Расея. Латышскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ў рыжскіх дыплёматычных сфэрах чакаюць зваротку польскага ўраду к Савецкай Расеі з ультыматумам, вымагаючым падпісаньня міру ў азначаны час.

Антанта і Нямеччына. Войскі хаўрусьнікаў занялі прырэйнскі вугольны порт Ганборн.

— Французы увайшлі ў Майнц.

— Ген. Гут абвесьціў стан абляжэньня ў Дюсельдорфе і забараніў забастоўкі. Усе тэатры і кінематографы зачынены. Арыштавана 20 камуністаў за намаўляньне пачаць агульную забастоўку.

Паустаньне супроць саветау Кранштадт выпусьціў па Пецярбургу 7.000 знарадаў.

— „Общее Дѣло“ паведамляе, што бальшавіцкая армія адступае на Гатчыну.

— Троцкі загадаў забіваць пяць белых за аднаго чырвонага („Affenbladet“).

Панядзелак, 14 сакавіка 1921 *г.*

Паустаньне супроць саветау. З Гэльсінгфорса паведамляюць, што бальшавіцкая армія супроць паустанцаў налічае 180.000 чалавек і складаецца з кітайцаў, латышоў, фінляндцаў, мад'яраў і немцаў.

— Водле тых-жа вестак, за астатнія дні выбухнула паўстаньне ў Варонежы, Ніжнем - Ноўгарадзе, Туле, Разані і Харкаву. Кіеў занялі паўстанцы атамана Струка.

— „Руспрэс“ паведамляе, што весткі аб разьмерах паўстаньня ў Расеі значна перабольшаны. Паўстаньне не абхапіла, як кажуць прыбыўшыя з Расеі асобы, шырокіх кругоў. Бальшавікі напэўна падавяць кранштацкае паўстаньне.

— Ад 13 сакавіка з Гэльсінгфорсу паведамляюць, што Троцкі здабыў Пецярбург. Адзелы маракоў і прылучыўшыхся да іх паўстанцаў адступілі на Петаргоф і Араніенбаўм.

— Пад націскам бальшавіцкага войска паўстанцы мусілі пакінуць Пскоў.

Забастоўка ў Маскве цягнецца далей.

Зьезд камуністау у Маскве. Радыо з Масквы паведамляе, што 8 сакавіка Ленін адчыніў дзесяты конгрэс расейскай камуністычнай партыі. У сваей прамове аб унутраным і надворным становішчы Савецкае Расеі Ленін прызнаў, што галоўнаю ўмоваю паляпшэньня гаспадарчага жыцьця Савецкае Расеі ёсьць аднаўленьне мірных адносін з буржуазнымі, капіталістычнымі ўрадамі ўсяго сьвету. Гаворачы аб унутранай палітыцы, Ленін каротка пераказаў гісторыю цяперашніх беспарадкаў і выразіў надзею, што савецкая ўлада неўзабаве зробіць с пакой.

Варшаускі Сойм аб Віленшчыне. *Варшава*, 11 сакавіка. Камісія заграничных спраў на астатнім паседжаньні зрабіла пастанову, у якой сьцьвярджае правы Польшчы на Віленшчыну. Камісія не прызнае літоўска-бальшавіцкае ўмовы 12 ліпня 1920 г. і выражаець згоду на польска-літоўскія перагаворы ў Брусэлі пад старшынствам прадстаўніка Лігі Народаў, але, тымчасам, выказываецца супроць арбітража. На выпадак немагчымасьці дасягнуць згоды з Літвою, польская рэспубліка павінна будзе выпаўніць свае абавязкі ў адносінах да насяленьня Віленшчыны і даць яму магчымасьць паказаць сваю волю аб лёсе Віленскае зямлі.

Францыя і Юго - Славія. Прэзыдэнт францускае рэспублікі Мільеран паехаў у Белград.

Францыя і Турцыя. Брыан зрабіў з турэцкай дэлегацыяй умову аб тым, каб зараз эвакуаваць Кілікію, абмяняцца палоннымі і ўзьдзержыцца ад няпрыязных дзеяньняў.

Расея і Румынія. Румынская дэлегацыя выехала 13 сакавіка ў Рэвель на перагаворы з Расеяю.

Аўторак, 15 сакавіка 1921 *г.*

Літва і Польшча. *Лендан, 11 сакавіка (Е. Е.). Прадстаўнік Літвы дастаў паведамленьне, што літоўскі урад згаджаецца на прапазыцыю Лігі Народаў аб беспасрэдных перагаворах з Польшчаю.*

Паустаньне супроць саветау З Гэльсінгфорса паведамляюць, што ўсе атакі паўстанцаў на вялікія гарады адбіты. У Адэсе супроць-бальшавіцкія маніфэстацыі задушаны агнем.

— Пажары ў Пецярбурзе нл сьціхаюць, бо вадаправоды папсуліся і няма як тушыць.

— Савецкія аэропляны бомбардыруюць Кроншадт.

Серада, 16-га сакавіка 1921 *г.*

Паустаньне супроць саветау. Гэльсінгфорс, 15 сакавіка (Е. Е.). Палажэньне паўстанцаў у Пецярбурскім раёне, пасьля нядоўгага аслабленьня іх, ізноў значна палепшала. Пецяргоф і станцыя Сяргееўская, на ўсход ад Пецярбурга, заняты паўстанцамі. Бальшавіцкі гарнізон, 8000 чалавек, перадаўся на бок паўстанцаў.

— Красная Горка (форт) абстрэлівае Кронштадт. (Аг. Орыент).

— Шлісельбург у руках паўстанцаў. (Агенцтва „Е. Е.“).

Паустаньне на Украіне. Украінскія паўстанцы забралі Жытомір і Стара-Канстантынаў. (Ор.).

Вайна у Бухары. „Правда“ паведамляе, што на тэрыторыі Бухары ідуць баі між войскамі эміра і савецкімі.

Антанта і Нямеччына. Ходзяць чуткі, што хаўрусьнікі акупіруюць навет Бэрлін. (Е. Е.).

Хоча, каб „Нашу Думку“ зачынілі.

У № 68 газэты „Rzeczpospolita“ нейкі пан Юзэф Пузына зьмесьціў артыкул пад назовам „Віленскі плебісцыт і беларусы“, дзе тужыцца хоць як-трохy аслабіць уражаньне ад артыкулу Віленчука пад назовам „Плебісцыт і беларусы“, зьмешчаным у № 7 „Нашае Думкі“.

Артыкул пана Юзэфа Пузыны мае гэткі чарнасоценны канчатак:

„Д з і ў н ы м з д а е ц ц а, ш т о „Н а ш а Д у м к а“ з я е с у п р о ц ь - п о л ь с к а ю п р а п а г а н д а ю м о - ж а в ы х а д з і ц ь у В і л ь н і п а д п о л ь с к і м і ў р а д а м і „С я р э д н я е Л і т в ы“.

Вось найлепшы довад у руках цывілізаванага супрацоўніка эўропейскае газэты: дубіна!

Пры надобным аргумэнце лішнім выглядае ўвесь артыкул пана Юзэфа Пузыны. „Rzeczpospolita“ рацыянальней зрабіла-бы, надрукаваўшы толькі паказаны канчатак клясычнага эндэцкага твору.

Урэшце—ўвага! Што разумець пад „антыпольскай прапагандай“? Прапаганды супроць польскай нацыі, супроць правоў польскага народа „Наша Думка“ не вяла, не вядзе і весьці ня будзе. Прапаганду супроць польскіх чарнасотнікаў яна ня лічыць „антыпольскаю прапагандаю“ і біла, б'е і будзе біць паноў Юзэфаў Пузын! Б'е словам, ня дубінаю.

N.

Правінцыяльны аддзел.

Баруны.

(Ашмянскага павету).

Дзякуючы стараньням Беларускай Школьнай Рады, Дэпартамэнт Асьветы Сярэдняй Літвы даў дазвол на адчыненьне ў Барунах—ў былых базіліянскіх мурох—Беларускае Вучыцельскае Сэмінарыі. Чуткі аб адчыненьні ў нас Сэмінарыі шырака разьнесьліся па акалічных валасьцёх і на першы дзень прыймовых экзаменаў, 15 лютага, зьехалася і сышлося у Баруны шмат падросткаў—хлапцоў і дзяўчат. Да 20 лютага было прынята ў Сэмінарыю пасьля экзаменаў 58 асоб,—42 хлапцы і 16 дзяўчат, з якіх, ў залежнасьці ад іх ранейшай падгатоўкі, зразу-ж былі складзены першыя дзьве клясы сэмінарыі.

20 сакавіка ужо будзе месяц, як ідуць сыстэматычныя выклады лекцыяў ў гэтай першай беларускай сэмінарыі. Дзеля няпрыбыцьця з-за розных прычын некаторых вучыцялёў, выкліканых на працу дырэктарам сэмінарыі Рак-Міхайлоўскім, наличным складам пэдагогаў вядуцца заняткі з р.-каталіцкае рэлігіі, беларускае мовы, польскае мовы, арытмэтыкі, геомэтрыі, географіі, нямецкай мовы, пяяньня і гімнастыкі. Ужываюцца ў сэмінарыі падручнікі, друкаваныя лацінкай; па рэлігіі большасьць вучняў сэмінарыі—р.-каталікі. Па роду і мейсцу жыцьця—найбольшую лічбу вучняў дала наша Куцэвічская воласьць (ў якой лічуцца і самыя Баруны), далей ідуць валасьці Крэўская, Гальшанская, Забрэзская, Палянская, Палачанская і, нарэшце, навать Лебедзеўская.

Пры сэмінарыі арганізаваны інтэрнат на 35 чалавек і нарыхтована агульная кухня з прадуктаў ад бацькоў вучняў і з амэрыканскіх дароў.

Дзякуючы энергіі дырэктара і вучыцялёў сэмінарыі, неабходны рэмонт запушчанага і зьнішчанага ў часе вайны будынку быў зроблены надта хутка; усе, патрэбныя для сэмінарыі памешканьні маюць выгляд зусім здавальняючы пры варунках сучаснай дарагоўлі і браку патрэбных грошай і матэрыялаў. Вучні сэмінарыі увесь час прыймалі жывы удзел у працы па ачыстцы забруджанага ў часе пабыту войскаў будынку і цяпер прыемна зусім навет пабочнаму чалавеку зайсьці ў будынкі гэтых старых уніяцкіх муроў.

Вучні сэмінарыі з захватам прыняліся за навуку ў сваей роднай мове; выхаваньне будучых вучыцялёў пастаўлена практычнай рукой пэдагогаў на належную вышыню, што ў параўнаньні з зьмешчаючайся ў гэтых-жа самых мурох польскай пачатковай школай кідаецца кожнаму ў вочы.

Дырэктар нашай сэмінарыі—ідэолёг супольнага згоднага жыцьця беларускае і польскае людзасьці, і ў гэтым напрамку ім і вядзецца праца цяпер, як праводзіў ён яе і раней. Акалічныя вёскі і суседнія з Куцэвічскай воласьці сімпатызуюць яму і сэмінарыі і спагадаюць, але на жаль навет гэткая праца згоды не падабаецца 3-4 асобам з самых Барунаў; гэтыя ортодоксы польскай эндэцыі на мяйсцох, падтрымоўваемыя вядомай тут у нас абшарніцай, намагаюцца распаліваць нацыянальны антагонізм, каб стлуміць здаровую нармальную працу сэмінарыі у нас, каб пазбавіць нашых дзяцей гэтай вучэльні. Яны агітуюць на вёску у на ўсіх проці сэмінарыі і ўсімі праўдамі і няпраўдамі стараюцца зьбіраць подпісы сярод сваіх знаёмых аб зачыненьні ці аб пераводзе ў іншае места сэмінарыі.

Мы спадзяёмся, што усё-ж ўлада Сярэдняе Літвы ня зьверне увагі на пратэсты і агітацыю гэтых людзей, я я для сабраньня большага ліку подпісаў пад пэтыцыяй проці беларускай сэмінарыі ужывалі запужаваньня нас, каталіцкай людзасьці, што паскольку ў сэмінарыю прыймаюцца і праваслаўныя беларусы, дык потым сэмінарыя можа адабраць касьцёл і перавярнуць яго на царкву і інш. мотываў.

Калі-б ўлада і дапусьціла такую памылку, як перавод сэмінарыі у другое места, асабліва цяпер, сярод навуковага году,—дык гэта-б было роўназначна зачыненьню сэмінарыі, бо ніхто з нас, бацькоў, ня можа паслаць сваіх дзяцей ў другое места, прыкладам у Вільню, бо мы ня здолеем дастаўляць туды, так далёка, харчаваньня дзецям. Пры нашай беднасьці, як жыхараў былога франтавага пасу, толькі ітнаваньне сэмінарыі ў Барунах можа здаволіць нашы культурна-асьветныя запатрабаваньні.

Адзін з бацькоў.

Тутэйшае жыцьце.

Арышт рэдактара „Pochodni“ п. Грышуна. У панядзелык 7 сакавіка на вуліцы быў заарыштован рэдактар „Pochodni“ п. Грышун. Прычыны — невядомыя.

Карысная дзеяльнасьць. Віленскі Хаўрус Коопэратываў запрасіў прафэсара Вацлава Іваноўскага, адмыслоўца сушыць плады, каб ён наснудзіў гэтую справу ў раёне дзеяльнасьці Хаўруса. Праф. В. Іваноўскі, як ведама, даўны сьвядомы беларус, трапіў быў у польскія міністры Сярэдняе Літвы, але мусіў падацца ў дымісію і цяпер вось мае заняцца карыснай дзеяльнасьцю.

Віленскі Хаўрус Коопэратываў (М. Пагулянка 12) дастаў 5 вагонаў пшанішнай мукі, 1 вагон сьвіннога сала і 1 вагон рысу. Прыйшла коламазь, у якой чулася вялікая патрэба.

— Хаўрус пачынае загатоўку яек.

З беларускага жыцьця.

Новая газэта. У нядзелю 20 сакавіка мае выйці ў Вільні новая беларуская газэта „Беларускі звон“.

Гімназіяльны вечар. Спэктакль, пастаўлены 11 сакавіка 1-ай Віл. Бел. Гімназіяй на карысьць сваіх маламожных вучняў, прайшоў з вялікім усьпехам. На вечарыне было шмат віленскай літоўскай інтэлігенцыі.

Гімназія ў Гарадку. Надоячы быў у Вільні дырэктар Беларускае гімназіі ў м. Гарадку, Вялейскага павету, грам. Тышкевіч. Гімназія ў Гарадку мае пакуль што чатыры клясы і адну прыгатавальную. Вучняў блізка сотні. Помешканьня гімназія ніадкуль не дастае і жыве на кошты вучняў. Беларускую мову выкладае грам. Кісялевіч.

Новая школа. Як мы даведаліся, з 1-га лютага пры Віленскай Беларускай гімназіі адчынілася пачаткавая школа.

„Плакала лета, зямлю пакідаючы“, вядомы верш нябожчыка Максіма Багдановіча, паклаў на музыку композытар В. Багдановіч, рэктар віленскай праваслаўнай сэмінарыі.

3 гады абвешчаньня незалежнасьці. Віленскае Беларускае грамадзянства дзеяльна рыхтуецца к сьвятканьню 25 сакавіка г. г. трох гадоў з часу абвешчаньня незалежнасьці Беларусі. Маюць быць урачыстыя паседжаньні арганізацый, сходы з урачыстымі прамовамі, аглядам мінуўшых трох гадоў у жыцьці Беларусі і інш. Вучнёўскай моладзі і шырокім масам будзе ўсебакова выясьнена вялікае значаньне гэтага акта ў нашай гісторыі. У чародным № „Нашае Думкі“ будуць зьмешчаны сьвяточныя артыкулы.

На Вялікдзень вучні беларускіх пачатковых школ, па пастанове Беларускага Аддзела Дэпартамэнта Асьветы, бу-

дуць адпушчаны пасьля заняткаў у сераду на сьвятым тыдні і зьбяруцца цераз тыдзень у чацьвер.

Праваслаўныя дзеці будуць гавець у час каталіцкіх сьвят.

Ня плоцяць.

Вучыцялі правінцыяльных беларускіх пачаткавых школ не дасталі дагэтуль грошы за люты (феўраль) і студзень (январ) гэтага года.

Білютэнь Юрыдычнага Аддзелу Віленск. Беларуск. Нац. Камітэту.

У гэтым аддзеле газэты „Наша Думка" Юрыдычны Аддзел будзе памяшчаць усялякія распараджэньні і пастановы ўлады і даваць свае разьясьненьні. Апрача гэтага, тут-жа будзе давацца рада па пісьменым запросам.

Аб выплаце грошай па рэквізыцыйным квіткам.

Для выплаты грамадзянам грошай за рэквізыцыі з боку войскаў польскіх, а таксама войскаў Літвы Сярэдняе ў Вільні абразована Галоўная Чрэзвычайная Камісія рэгуляваньня страт.

Гэтая камісія рэгуліруець страты вышэй як на 30.000 мар. (месьціцца ў м. Вільні, Юраўскі перавулак, д. Міцкевіча № 4, кв. № 18, процiў палаца кс. Агінскай).

Для рэгуляваньня страт меньш, як на 30.000 марак, арганізованы Гмінныя Камісіі, якія выяжджаюць на месцы і на месцы-ж плацяць грошы.

Пакуль што выплачваюцца грошы за рэквізованыя прадукты, фураж, інвентар усялякі—паводлуг далучаямай табліцы цэн, зацьверджанай праз Галоўнакамандуючага вайскамі Сярэдняе Літвы.

Першыя цыфры — цэны ў жніўню 1920 г.

Другія—у восень 1920 г. і пазьней.

Жыта пуд 150 — 300 м., пшаніца 226—400; авёс, ячмень, гарох, грэчка,—124—250, крупы 150—300, мука пшанічная 180—360, бульба 20—40, сена 20—40, салома жытная 10—15, аўсяная 15—25, дробная скаціна 800—1000 за пуд жывыя вагі, буйная скаціна 200—500, цяляты (штука) 750—1000, авечкі 600—1000, жыр пуд 1000—2000, коні слабыя 10.000—15.000, сярэднія—15.000—20.000, добрыя 20.000—30.000, воз дзер. 2.000—3.000, зялезныя адзіночкі 4—6000, паракоты—5 — 7.000, кола шт. 250 — 400, хамуты 150—300 м.

Паштовая скрынка.

Вульфу Сосенскаму. Газэту высылаем. Пісьмо ў Выдавецтва Клецкіна аддалі. Шукайце падпішчыкаў і прысылайце карэспандэнцыі.

Франуку Пяткевічу. Грошы пасланыя Вамі з Нясьвіжу 2. II—1921 г.—квіт № 7, 200 марак, мы дагэтуль не атрымалі, Адказы на цікавячыя Вас пытаньні знойдзеце ў „Нашай Думцы", якую з гэтага нумара будзем высылаць Вам. Грошы спаганяйце з пошты і прышліце з аказіяй або прысылайце карэспондэнцыі з залічэньнем гонарару за іх на падпіску.

Краўцову Макару. Ліст, у якім пытаецеся, ці прысылаць успаміны аб Конгрэсе 1917 г., мабыць, яшчэ бадзяецца ў дарозе. Разумеецца, прысылаць. Аб Алесе Гаруну пойдзе ў бліжэйшых нумарох. Пішэце часьцей.

Нетарасаву. І. Г. Антоваў знаходзіцца цяпер у Коўні. Даведацца праз Беларускае Міністэрства.

Балаховцу. Васпан жалішся, што мы у слова „белы" укладаем няпрыхільнасьць да „беларускае" арміі „бацькі" Булаховіча, бо, відаць, дастаеш грошы ад бальшавікоў. Доказам „беларускасьці" Булаховіча, напэўна, паказуеш тое, што ваш бацька дужа добра умее пабеларуску і навет каталік. Усе гэта—дзяцінныя размовы і палемікус панам пачынаць ня маем часу. Граматыку беларускую можаце выпісаць з Беларускай Кнігарні (Вільня, Завальная 7); мы кніг ня высылаем. „Нашу Думку" высылае кантора газэты у ліку 5 экземпл. Літературнай Камісіі Расейскага Эвакуацыйнага Камітэта у Варшаве. Прышліце адрэс, дык будзем пасылаць проста, калі так будзе дахадзіць. Пісьма, аб якім гаворыце, мы у „Свободе" ня чыталі,—можа й праўда. Урэшце зазначым, што „изучать бѣлорусскій языкъ отъ скуки" можаце толькі вы і да вас падобныя балахоўскія беларусы. У гэтым мы не сумляваемся. Але „бѣлорусская демократическая интеллигенція" так-сяк, а што беларускі селянін і работнік, то ужо напэўна як-кольвек абойдзецца без васпана.

А. Розэнберг. Дзякуем за прысланае, чакаем яшчэ.

Гаспадару з-пад Ліды. За добрыя карэспандэнцыі плоцім па 2 маркі за радок. Грошы высылаем і па пошце.

Загранічным. Сорам, што ня шлеце нам інформацыю.

Свабодпаму. Арганізуйце продаж „Нашае Думкі" у м. Сьвіры і у ваколіцах.

ІНФОРМАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ.

Бібліятэка Беларускага Навуковага Т-ва будзе адчынена дзеля карыстаньня на месцы для навуковых мэт ў памяшчэньні Т-ва пры Вострабрамскай вул. № 9.

Беларускае Выдавецкае Т-ва выдае ўсялякія кніжкі ў беларускай мове Сябраў прынімае Урад Т-ва. Уступная плата — 50 м., сяброўская гадавая складка — 100 м. Адрэс Т-ва: Віленская вул. № 33, кв. 1 (адчынена ад 4 да 5 гадз. у дзень).

Бібліятэка б. „Знаніе" мае багаты выбар кніжак да чытаньня ў розных мовах. Адчынена: 10—1 і 3—6 гадз. Адрэс: Віленская 33.

Беларуская Кнігарня „Беларускага Выдавецкага Т-ва" мае на прадажы ўсе беларускія кніжкі. Адрэс: Завальная 7.

Беларускі Нацыянальны Камітэт месьціцца ў Вільні, Вострабрамская, 9, пакой № 5. Старшыня Ф. Ярэміч, Робіцца рэгістрацыя беларусаў і даецца духоўная і матар'яльная помач

1-я Віленская Беларуская Гімназія месьціцца на Вострабрамскай вул., 9. Дырэктар М. Кахановіч, інспэктар А. Дмахоўскі.

Беларускія пачатковыя школы ў Вільні. 1) Кальварыйская, 73, 2) Лідзкі тракт, могільнік; 3) Радунская, 27-а; 4) Зарэчча, Панамарская, 12. Навука бясплатная. У кожнай школе даецца дзяцём сьнеданьне.

Беларускі Школьны Аддзел. Вільня, Каўкаская вуліца (рог Вялікай Пагулянкі), 2, другі паверх, налева, пакой № 13.

Беларускі Вучыцельскі Саюз Канцэл. 1-й Віленскай Беларускай Гімн

Прытулак Камітэта Помачы Вострабрамская, 9 (будынак гімназіі). Загадчыца Л. Васілевіч.

Віленскі Саюз Коопэратываў Малая Погулянка, дом № 12

Коопэратыў „Райніца" ў Вільні. Вялікая Пагулянка, 17.

Беларускі Клюб ў Вільні. Біскупская, 12.

Літоўская поліклініка. (Віленская вул. процi Дабрачын. зав.) прыймае хворых ў аддзяленьнях: хірургічных хвароб, унутраных, на вочы, акушэрства і гінеколёгіі. Пользу даюць адмыслоўцы за самую невялічкую плату.

Доктар А. В. Краскоўскі. Прыймовыя гадзіны: да 10, 1½—2½, 5—6 у сераду ад 6. Вострабрамская, 20, кв. 6.

У астатнюю мінуту.

Закрыцьце беларускай сэмінарыі.

У часе друкаваньня гэтага № мы атрымалі вестку, што 14 сакавіка а 2 гадзіне ў дзень, ў часе выкладаньня лекцыі па р.-каталіцкай рэлігіі, сэмінарыя была зачынена рэвіровым I району Ашмянскага павету Пугачэўскім з распараджэньня Ашмянск. старасты ад 12.I 1921 г. за № 1381. (Гл. „Баруны").

Рэдактар-Выдавец М. ГАРЭЦКІ

Кооп. Друкарня „ДРУК", Вострабрамская, 5.